# Танцаваць — значыць аддаваць



**Што стане справай майго жыцця? Адказ на гэтае пытанне наша гераіня знайшла яшчэ ў дзесяцігадовым узросце. Сёння студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ірына Капусціна — прызёр Дэльфійскіх гульняў, супастаноўшчык творчага праекта "Лінія памяці. Код вайны". Пра любоў да танца, творчыя ідэі ды планы таленавітая дзяўчына распавяла "К".**



— Па словах мамы, я была вельмі смелым дзіцем і з пачатковай школы ўдзельнічала ва ўсіх магчымых конкурсах. Я аказвалася ўсюды, дзе можна было выступіць на сцэне. Займалася вакалам, фартэпіяна, гімнастыкай. Мяне не трэба было прымушаць хадзіць у гурткі: любая актыўнасць, звязаная з мастацтвам, мне падабалася. Танцы прыйшлі ў маё жыццё, калі споўнілася пяць гадоў, я адразу ж палюбіла харэаграфію. Трэніроўкі амаль не прапускала — для гэтага мусіла быць надзвычай важкая прычына.

## ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНАЯ СУСТРЭЧА

Спецыяльную адукацыю Ірына атрымала ў Мінскім харэаграфічным каледжы мастацтваў. Падчас апошняга экзамену выпускнікоў наведалі прадстаўнікі БДУКМ і прапанавалі дзяўчыне працягнуць навучанне ва ўніверсітэце. Летась Ірына Капусціна паспяхова здала іспыты і стала студэнткай вышэйшай навучальнай установы па спецыяльнасці "Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)". Менавіта там адбылася лёсавызначальная сустрэча з Вольгай Наўроцкай, старшым выкладчыкам кафедры харэаграфіі, якая ўбачыла ў нашай гераіні будучага паспяховага балетмайстра.

— Асаблівых цяжкасцей ад вучобы ва ўніверсітэце я не чакала. Складанасці ўзнікаюць толькі ў плане часу, яго катастрафічна бракуе. Калі рабіць усё з любоўю да справы, то спаць даводзіцца тры гадзіны ў суткі — толькі так магчыма ўсюды паспець. Тут усё залежыць ад растаноўкі прыярытэтаў.

## ЯК ПАБУДАВАЦЬ ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ МОСТ?

У БДУКМ у дзяўчыны з'явілася магчымасць больш выступаць на сцэне з беларускімі артыстамі. Напрыклад, яна ўжо папрацавала з Алёнай Ланской, Ірынай Дарафеевай у рамках святочных канцэртаў да Дня Перамогі і "Славянскага базару ў Віцебску".

— Вядома, ёсць момант хвалявання перад выхадам, але гэта абсалютна нармальна. Даносіць са сцэны пачуцці і будаваць масты паміж гледачом і артыстам — гэта самае галоўнае шчасце!

## ЗАСЛУЖАНАЯ ЎЗНАГАРОДА

Ужо на першым курсе ў студэнткі ўзнікла ідэя стварыць свой танцавальны праект. Вынікам гэтай задумы стала прызавое трэцяе месца на Дэльфійскіх гульнях.

— У мяне быў досвед удзелу ў спектаклях, і менавіта пасля гэтага мне захацелася ствараць уласныя шырокафарматныя працы. Так і нарадзіўся праект "Inhale". Спачатку нас было чацвёра, але паступова далучаліся новыя таленавітыя танцоры. На Дэльфійскія гульні мы і адправілі сваю першую сумесную працу ў фармаце відэа, бо адбор праходзіў дыстанцыйна. У нумары была закладзена наступная ідэя: у сучасных рэаліях людзі робяць акцэнт на фізічным свеце, грэбуючы ўнутраным, пошук балансу паміж імі, прыняцце кожнага складніка — неад'емны этап у жыцці кожнага. Мы вельмі ўдзячныя, што нашы старанні былі высока ацэнены на такім прэстыжным конкурсе.

## ЯК РАСКАЗАЦЬ ПРА ЖАХІ ВАЙНЫ?

У маі адбылася прэм'ера праекта "Лінія памяці. Код вайны", прысвечанага падзеям 1941—1945 гадоў. Разам са сваёй выкладчыцай Вольгай Наўроцкай Ірына працавала над стварэннем спектакля, які быў удастоены гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры.

— Сёлета на конкурсе "Дэнс Кангрэс" ставіла нумар "Лічбы на сэрцы", які заняў другое месца. Танцоры з гэтага нумара ўдзельнічалі і ў праекце "Лінія памяці. Код вайны". Пасля таго як я пачала працаваць менавіта з гэтымі дзяўчатамі, стала рабіць акцэнт на тое, каб раскрыць канкрэтнага артыста з яго самага моцнага боку. Раней была засяроджаная на малюнках, перастаноўках, цікавых формах. Гэта самы эмацыянальны праект, у якім я брала ўдзел. Працаваць над ім было вельмі цікава і адначасова складана. Гэта той момант, калі ты вельмі добра разумееш, пра што танцуеш, і ўкладаеш у кожны рух душу, каб усё знайшло адпаведны водгук у гледача. Варта адзначыць, што пастаноўка атрымалася адукацыйнай, бо ў ёй выкарыстоўвалася шмат фактаў пра вайну. Разам з эмацыянальнымным падмацаваннем уся гэтая інфармацыя ярчэй і мацней запомнілася публіцы.

## ГАДАВАЦЬ ЮНЫХ ЗОРАК

У разуменні Ірыны паняцце "танцаваць" цесна звязана з дзеясловам "аддаваць", а слова "харэаграфія" асацыюецца з любоўю. Ёй дзяўчына з радасцю дзеліцца са сцэны, на майстар-класах і трэніроўках.

— Ідэй для пастановак хапае. Альбо мне пазначаюць задачу, альбо ў самой узнікаюць думкі. Праблем з натхненнем няма. Любая сітуацыя на вуліцы, у чалавечым асяроддзі, кожны заўважаны рух — калі пачаць шукаць і асэнсоўваць, — усё можна пераўтварыць у ідэю для пастаноўкі. У планах — стаць вядомым балетмайстрам і шмат выкладаць, а пакуль гадоў праз пяць буду працаваць з дзіцячымі групамі, каб гадаваць зорак.

І мары Ірыны спраўдзяцца: выкладчыкі разгледзелі яе талент і прапануюць удзельнічаць у поўнамаштабных праектах, аднагрупнікі і знаёмыя з павагай і захапленнем адгукаюцца пра яе творчасць. І хай яе плённая праца паслужыць прыкладам для падрастаючага пакалення.

**Настасся ЮРКЕВІЧ**

Фота з архіва гераіні